**Гужалоўскі Аляксандр Аляксандравіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

# РЭВАЛЮЦЫЙНАЯ БЕЛАРУСЬ У 1917 Г.: ДВОЕЎЛАДДЗЕ, ТРОХУЛАДДЗЕ, ШМАТУЛАДДЗЕ ЦІ БЕЗУЛАДДЗЕ?

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. у краіне склалася незвычайная канфігурацыя ўлады, сутнасць якой У. І. Ленін вызначыў як «двоеўладдзе» [19, с. 145—148]. Ленін разумеў дваеўладдзе як супрацьстаянне Часовага ўрада і Петрасавета, разгядаючы іх у якасці альтэрнатыўных і раўнапраўных цэнтраў улады, што сыходзілі з процілеглых класавых інтарэсаў: у першым выпадку — з інтарэсаў буржуазіі, у другім — з інтарэсаў працоўных. Гэта ленінскае азначэнне савецкія гісторыкі ўспрынялі ў якасці метадалагічнага пастулату і выкарыстоўвалі ва ўсіх працах, прысвечаных рэвалюцыі 1917 г. Для сённяшняй постсавецкай гістарыяграфіі рэвалюцыі характэрны актыўны перагляд традыцыйных уяўленняў і схем, пошук новых ідэй і канцэпцый. Напрыклад, беларускі гісторык І. А. Саракавік, характарызуючы сітуацыю ў Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай і неакупаванай частcкі Віленскай губерняў, што склалася ў 1917 г. сцвярджае, што «рэальная ўлада знаходзілася ў руках вайскоўцаў». Ён нават вызначае канкрэтныя дату і падзею (стварэнне 27 кастрычніка 1917 г. франтавым камітэтам Заходняга фронту Камітэта ратавання рэвалюцыі), калі вайскоўцы сталі «арганізацыйна афармленай трэцяй уладай як палітычнай сілы» [29, с. 227]. Тым не менш, беларуская гістарычная навука яшчэ не стварыла аргументаванай мадэлі ўладных адносінаў у разглядаемы час, па-ранейшаму прапануючы аўдыторыі [11, с. 318], у т. л. студэнтам [18, с. 9] і школьнікам [10, с. 145] спрошчаную, састарэлую схему.

Аналіз гістарыяграфіі і першакрыніц дазваляе выказаць сумнеў у прапанаванай Леніным інструментальнай мадэлі, якая на працягу XX ст. пераўтварылася ў непарушную догму. Разуменне двоеўладдзя як суіснавання паралельных сістэм улады і кіравання ў выглядзе Часовага ўраду і Саветаў у сакавіку — ліпені 1917 г. выклікала пярэчанні ў шэрагу гісторыкаў — спачатку замежных [8, с. 85; 16, с. 34], потым — расійскіх [3, с. 66—73; 17, с. 19—23; 20, с. 166—175]. Адным з напрамкаў, па якіх ленінская канцэпцыя двоеўладдзя крытыкуецца яе апанентамі з'яўляецца механічнае перанясенне уладнай мадэлі, што склалася ў Петраградзе на другія рэгіёны краіны. Гэта ў поўнай меры тычыцца шматэтнічных, шматканфесійных беларускіх губерняў, якія апынуліся ў непасрэднай блізкасці ад лініі фронта.

Адразу ж пасля прыходу да ўлады, стваральнікі новай ліберальна-дэмакратычный Расійскай рэспублікі дэлігімітызавалі старую імперскую ўладу і яе мясцовыя структуры. У першыя дні рэвалюцыі пад кіраўніцтвам партыі кадэтаў пачалося правядзенне адміністрацыйна-упраўленчай рэформы. Напачатку сакавіка 1917 г. замест губернатараў былі ўведзены пасады губернскіх камісараў, у падпарадкаванні якіх знаходзіліся павятовыя і гарадскія камісары Часовага ўраду, змяніўшыя земскіх начальнікаў. На новыя пасады прызначаліся, як правіла, старшыні губернскіх і павятовых земскіх упраў і гарадскія галовы. Такім чынам, Часовы ўрад абраў у якасці сваёй сацыяльнай апоры на месцах вышэйшы слой земскіх працаўнікоў, пераважна дваран паводле сацыяльнага паходжання.

У Мінску напачатку сакавіка цыркулярнае распараджэнне ўрада аб наданні яму вышэйшых уладных паўнамоцтваў у губерніі атрымаў старшыня губернскай земскай управы, адстаўны гвардыі ротмістр драгунскага палка, член партыі кадэтаў Б. М. Самойленка. Тады ж адбылася перадача ўлады ад віцебскага губернатара Б. М. Хітраво старшыні губернскай земскай управы М. Л. Карташову. У Магілёўскай губерні ўлада перайшла таксама да старшыні губернскай земскай управы В. А. Судзілоўскага. У Гомелі на пасадзе гарадскога камісара быў зацьверджаны былы паліцмейстэр Ф. М. Фен-Раеўскі. Мэты і задачы ўрадавых камісараў прынцыпова не адрозніваліся ад функцый былых губернатараў. Як і іх папярэднікі, камісары былі павінны назіраць за законнасцю дзейнасці мясцовых устаноў і цывільных асоб, падтрымліваць парадак на вызначанай тэрыторыі. Новым было тое, што ў сваёй дзейнасці камісары абапіраліся на грамадскія «камітэты грамадскай бяспекі», у склад якіх уваходзілі гласныя гарадскіх дум, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, настаўнікі, святары, але найперш — земскія працаўнікі [32, с. 28—31].

Перадача паўнамоцтваў на ніжніх паверхах дзяржаўнай улады адбывалася больш складана, супярэчліва. Напачатку мая 1917 г. памочнік мінскага губернскага камісара К. А. Петрусевіч быў вымушаны уладжваць канфлікт у Пінску, дзе служачы земскага саюза Таганаў з дапамогай салдат арыштаваў павятовага камісара Гейроха і абвясціў сябе камісарам Пінскага павета. Праз некалькі дзён К. А. Петрусевіч быў вымушаны развязваць падобную канфліктную сітуацыю ў Рэчыцкім павятовым камісарыяце [23, с. 3]. У Барысаве напачатку чэрвеня скарыстаўшы барацьбу за ўладу, яка ішла паміж павятовым камісарам Арскім і старшынёй гарадской думы доктарам Брукам, уладу захапіў нейкі прапаршчык Вульфіўс [24, с. 3]. Тады ж месца вызваленага мінскага павятовага камісара Гушчынскага заняў штабс-капітан Міхельсон [5, с. 3]. У Дрысенскім павеце рэвалюцыйным зменам супрацьстаялі былыя ўраднікі, якія не збіраліся пакідаць свае паўнамоцтвы, святары, нацкоўваўшыя жанчын на эмісараў Часовага ўрада як на ерэтыкаў і гандляры, што супрацьдзейнічалі развіццю спажывецкаму кааператыўнаму руху [31, с. 4]. У Веліжскім павеце былы земскі начальнік Кутузаў вёў «летапіс» усіх дзеянняў новай улады, тлумачучы гэта тым, што ён «хутка спатрэбіцца» [30, с. 6]. Няпэўнасць сітуацыі добра адчувалі беларускія сяляне. Невыпадкова, адна з найбольш упарта цыркуляваўшых у сялянскім асяродку чутак таго часу абяцала хуткае вяртанне Мікалая II з новым войскам і пакаранне ўсіх, хто быў «датычны да новага парадку» [25, с. 3].

Саветы салдацкіх, рабочых, сялянскіх і іншых дэпутатаў ствараліся рэвалюцыйным шляхам, па-за законамі і нормамі, як прадукт народнай творчасці, на сходах рабочых прадпрыемстваў, а таксама прадстаўнікоў левых партый і арганізацый. Выбары ў саветы салдацкіх, рабочых, сялянскіх і іншых дэпутатаў адбываліся не паводле тэрытарыяльнага прынцыпу, але паводле вытворчага. Таму прадстаўнікі так званых «непрацоўных класаў» (буржуазія, служачыя, студэнты) мелі шанец быць абраныя ў іх кіраўніцтва ў выпадку калі з’яўляліся членамі левых палітычных партый. Саветы дзейнічалі паводле прынцыпу прамой дэмакратыі, іх вытокі караніліся ў народным вечавым ладзе. Салдаты, гарадскія сацыяльныя нізы, а таксама бяднейшыя сяляне, практычна выключаныя з працэса стварэння структур Часовага ўраду на месцах, падтрымалі новую альтэрнатыўную ўладу. Усяго на працягу сакавіка ў гарадах і мястэчках

Беларусі было створана 28 саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў, буйнейшыя з якіх знаходзіліся ў Мінску і Віцебску. У ліпені іх колькасць павялічылася да 150 [1, с. 43].

На першым месцы ў дзейнасці саветаў стаяла агітацыя і прапаганда, мабілізацыя рэвалюцыйных сіл на барацьбу з класавым ворагам, накшталт арышту Полацкім саветам былога правадыра дваранства Віцебскай губерні, аднаго з лідараў рускіх манархістаў А. А. Рымскага-Корсакава. Потым ішла барцьба за паляпшэнне ўмоў працы, арганізацыя рабочага кантролю. І толькі ў трэцюю чаргу саветы займаліся пытаннямі надзённага жыцця — барацьбой са злачыннасцю, паляпшэннем харчавання, адукацыі, медыцынскай дапамогі. Арганізацыйна саветы ўяўлялі хутка рэагуючую сілу для вырашэння надзённых задач грамадска-палітычнага характару з дапамогай мітынгаў, маніфестацый, палітызаваных святаў і інш. Руцінным, штодзённым кіраваннем «другая ўлада» ўсур'ёз не займалася, бо не мела ні механізмаў уздзеяння на ўладу, ні падрыхтаваных кадраў, ні фінансаў. Праблемы штодзённага жыцця цікавілі саветы пераважна з пункту гледжання прыцягнення працоўных на ўласны бок.

Саветы, большасць якіх у Беларусі знаходзіліся пад кантролем эсэраў і меншавікоў, заявілі пра свае амбіцыі ў якасці альтэрнатыўнага цэнтра ўлады адразу ж пасля Лютаўскай рэвалюцыі. Так, паводле патрабавання выканкама віцебскага савета, 19 сакавіка 1917 г. толькі прызначанага губернскага камісара «рэакцыянера Карташова» змясцілі пад хатні арышт. Наступную кандыдатуру на гэтую пасаду — былога члена Дзяржаўнай думы і віцебскага гарадскога галаву, члена партыі кадэтаў А. А. Валковіча ўрад зацвердзіў ужо пасля ўзгаднення з саветам [7, с. 126, 156]. Па выніках разгляду скаргі Рэчыцкага савета салдацкіх, рабочых і сялянскіх дэпутатаў міністру ўнутраных спраў Г. Я. Львову, пазбавіўся ўласнай пасады рэчыцкі павятовы камісар [7, с. 438, 615]. У арсенале барацьбы саветаў за ўладу былі таксама іншыя, неканфрантацыйныя шляхі. Напрыклад, у канцы чэрвеня 1917 г. старшыня віцебскага савета рабочых дэпутатаў М. С. Цэтлін стаў прадстаўніком міністэрства земляробства па Віцебскай губерні [15, с. 4]. Многія прадстаўнікі іншых саветаў з'яўляліся членамі розных камісій, што дзейнічалі пры органах мясцовай улады і гарадскога самакіравання. А старшыня бабруйскага савета рабочых и салдацкіх дэпутатаў доктар В. В. Дамагараў быў абраны гарадскім галавой [2, с. 4].

Адной з важнейшых форм рэалізацыі народам атрыманай у выніку рэвалюцыі ўлады з'яўляліся органы мясцовага кіравання. Невыпадкова Часовы ўрад разумеў правядзенне рэформы гарадскога і земскага самакіравання ў якасці адной з найважнейшых і першачарговых задач. На ўзроўні мясцовага самакіравання прасочваўся ўвесь комплекс сацыяльных, палітычных і эканамічных праблем тагачаснага грамадства, тут сутыкаліся інтарэсы мясцовых эліт. У той жа час органы мясцовага самакіравання давалі магчымасць далучыцца да палітычнага працэсу, паўсядзённай дэмакратычнай практыцы шараговым грамадзянам у якасці актыўных яго ўдзельнікаў.

Вага гарадскіх дум як цэнтраў улады значна падвысілася пасля прыняцця закона 17 красавіка «Аб міліцыі». Ён скасоўваў паліцыю, надаваў міліцыянерам статус муніцыпальных служачых, а начальнікаў гарадской і павятовай міліцыі падпарадкаваў муніцыпалітэтам. Такім чынам, новыя органы аховы правапа-

радку, у адрозненні ад паліцыі, падпарадкаванай уладнай вертыкалі ў асобе губернатара, сталі структурнай часткай органаў мясцовага самакіравання.

9 чэрвеня 1917 г. Часовы ўрад прыняў пастанову, якая ўводзіла прынцып самастойнасці органаў гарадскога самакіравання, пашырала правы і рэгламентавала абавязкі думскіх гласных. «Кантроль за мэтазгодгасцю» дзейнасці гарадскіх дум з боку прадстаўнікоў ураду адмяняўся. Замест «кантроля» уводзіўся «адміністрацыйны нагляд» за законнасцю думскіх пастаноў, які ажыццяўляў губернскі камісар. Гэтая пастанова дала новы штуршок для развіцця муніцыпальных структур. Менавіта павышэннем статуса гарадскіх дум як уладных цэнтраў можна патлумачыць жорсткую барацьбу за месцы гласных, якія разгарнуліся падчас муніцыпальных выбараў летам 1917 г. У ёй, сярод іншых, удзельнічалі члены выканкамаў саветаў, напрыклад бундавец Р. Я. Арансон, якога віцебская гарадская дума зацьвердзіла на пасадзе гарадскога галавы.

Адначасова з правядзеннем рэформы гарадскога самакіравання, Часовы ўрад, многія міністры якога пачыналі сваю кар’еру ў земствах, распрацаваў земскую рэформу. 21 мая 1917 г. быў прыняты закон, паводле якога завяршалася будаўніцтва сістэмы самакіравання на вёсцы. У дадатак да ўжо існаваўшых губернскіх і павятовых земстваў, уводзіліся валасныя земствы. Акрамя гэтага, рэформа значна пашырала паўнамоцтвы і аўтаномію земстваў усіх узроўняў. Да старых, дарэвалюцыйных сфераў заняткаў органаў мясцовага кіравання, такіх як адукацыя, ахова здароўя, статыстыка, дарожнае будаўніцтва, аграномія, кааперацыя, дадаліся новыя. Да кампетэнцый земстваў аднеслі таксама аказанне юрыдычнай дапамогі насельніцтву, ахову працы, кіраўніцтва міліцыяй. Земскія служачыя больш не зацьвярджаліся на сваіх пасадах адміністрацыйным апаратам і мелі права на прафсаюзную дзейнасць. Губернскі ці павятовы камісар мог апратэставаць рашэнні земстваў толькі праз суд. Неўзабаве з мэтай паляпшэння фінансавага становішча органаў самакіравання паўстаў Дзяржаўны банк земскага і гарадскога крэдыту [12, с. 16—20].

Становішча, настроі і роля Рэвалюцыйнай арміі свабоднай Расіі ў падзеях 1917 г. дазволілі некаторым даследчыкам (А. Б. Асташоў) казаць пра «ваенную рэвалюцыю». Пасля адступлення 1915 г. чатыры беларускія губерні ператварыліся ў тылавую зону Заходняга фронта, штаб якога размясціўся ў Мінску. Маглёў стаў месцам дыслакацыі Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага, у якой налічвалася больш 2 тыс. генералаў, старэйшых афіцэраў і чыноўнікаў. Гомель ператварыўся ў буйную ваенную базу, дзе акрамя майстэрняў, складоў і паркаў, меўся перасыльны пункт, на якім утрымлівалася 20—30 тыс. ваеннаслужачых.

У адпаведнасці з Законам аб ваенным становішчы 1892 г., вярхоўная ўлада ў прыфрантавых губернях пераходзіла да ваеннага камандавання. Гэта азначала, што цывільная адміністрацыя павінна была выконваць усе патрабаванні і ўказанні ваенных уладаў. Апошнія атрымалі права зачыняць цывільныя ўстановы, органы мясцовага самакіравання, здымаць службовых асоб, забараняць выпуск друкаваных выданняў, абвяшчаць каменданцкую гадзіну і г. д. Большасць прадпрыемстваў і ўстаноў тылавой зоны ў той ці іншай ступені былі звязаны з абслугоўваннем арміі. Там паўстала адпаведная інфраструктура — ваенныя склады, шпіталі, рамонтныя і будаўнічыя арганізацыі.

Узмацненню ўплыву арміі на сацыльна-палітычнае і эканамічнае жыццё Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і неакупаванай часткі Віленскай губерній паспрыяла не толькі іх пераўтварэнне ў тылавую зону, але таксама рэвалюцыйныя падзеі. У гэты час значна пашырыліся і паглыбіліся працэсы палітызацыі арміі, узмацнілася сацыяльная актыўнасць ваеннаслужачых. Армейскія масы сталі неад'емнымі ўдзельнікамі ўсіх значных рэвалюцыйных падзей. Загад № 1 Петраградскага савета асобным пунктам уводзіў салдацкія камітэты, што азначала фактычную адмену прынцыпа адзінаасобнага камандавання ў войску. Салдацкія камітэты адразу ж увайшлі ў канфлікт з афіцэрскім корпусам. У выніку да ліпеня 1917 г. на Заходнім фронце было звольнена каля 60 палкоўнікаў і генералаў, якія выказвалі прынцыповую нязгоду з палітызацыяй арміі [13, с. 28].

Важным крокам на шляху пераўтварэння арміі ў палітычную сілу стаў З'езд дэпутатаў армій Заходняга фронту 7—8 красавіка 1917 г. у Мінску. На з'ездзе, які праходзіў у гарадскім тэатры, прыбыло 1200 дэлегатаў і каля 100 гасцей. Сярод апошніх быў старшыня Дзяржаўнай думы М. У. Радзянка, а таксама члены думы М. І. Скобелеў, І. Г. Цэрэтэлі і М. С. Чхеідзэ. Напрыканцы з'езда быў абраны франтавы камітэт, дзе бальшавікі склалі меншасць [22, с. 3]. Неўзабаве на Заходнім фронце з'явіліся палкавыя, дывізіённыя, карпусныя, армейскія салдацкія камітэты, агульная колькасць якіх на 1 верасня 1917 г. склала 7284 [14, с. 141]. У сваю чаргу Часовы ўрад для ўсталявання кантролю над вышэйшым армейскім камандаваннем стварыла Палітычнае ўпраўленне з штатам ваенных камісараў. 15 ліпеня пры камандуючым Заходнім фронтам — у той час генерал-лейценанце А. І. Дзенікіне, з'явіўся франтавы камісар, адвакат па прафесіі, сацыял-дэмакрат «з катаржным вопытам» У. А. Жданаў, які адразу ж абвясціў сябе «міністрам абароны» Заходняга фронту і тылавой зоны.

Не звяртаючы ўвагі на загады старога і новага начальства, узброеныя рэвалюцыйныя салдаты частак Заходняга фронту дэ-факта ажыццяўлялі ўладныя функцыі ў тылавой зоне. Напрыклад, яны з задавальненнем бралі на сябе абавязкі цывільных судова-следчых органаў. Так, пакліканыя ў верасні 1917 г. міліцыяй дапамагчы знайсці збеглых вязняў, салдаты Бабруйскага гарнізона па дарозе ў турму «скалолі спайманых штыкамі» [6, с. 3]. 21 кастрычніка натоўп салдат уварваўся ў камісарыят чыгначнай міліцыі Магілёва і, нягледзячы на пратэсты міліцыянераў, выцягнуў абкраўшага вайскоўца злодзея, пасля чаго зверскі яго збіў [26, с. 4]. 19 лістапада гомельская міліцыя арыштавала салдата, які спрабаваў абрабаваць банк, але неўзабаве была вымушана адпусціць пад ціскам саслужбоўцаў арыштаванага [27, с. 4].

1917 год быў надзвычай важны для развіцця беларускага грамадска-палітычнага руху, фармавання нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, у ім быў закладзены фундамент сучаснага нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва. У той час назіралася не толькі павелічэнне колькасці беларускіх палітычных партый, але пашырэнне сацыяльнай базы беларускага палітычнага руху за кошт інтэлігенцыі, вайскоўцаў, сялян, рабочых і нават буйных землеўласнікаў. Беларускія палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі артыкулявалі аб'ектыўныя інтарэсы большасці беларусаў, праводзілі кандыдатаў у органы ўлады і самакіравання, распачалі барацьбу за палітычную і дзяржаўную ўладу.

Важкім аргументам у гэтай барацьбе было нацыянальнае войска. Ужо на першым пасяджэнні прэзідыўма Беларускага нацыянальнага камітэта ў Мінску 27 сакавіка 1917 г. было вырашана стварыць спецыяльную камісію па выпрацоўцы праекта беларускага народнага апалчэння [21, с. 3]. 15 мая адбыўся ўстаноўчы сход «Ваеннае Беларускае Арганізацыі у Мінску» [9, с. 3]. З лета 1917 г. пачалі фармавацца беларускія арганізацыі і гурткі ў вайсковых падраздзяленнях. Працэс стварэння беларускага нацыянальнага войска яшчэ больш паскорыўся пасля ўтварэння ў лістападзе Цэнтральнай беларускай вайсковай рады з выканаўчым камітэтам на чале з С. Рак-Міхайлоўскім [4, с. 2].

На працягу 1917 г. беларускі грамадска-палітычны рух прайшоў вялікі шлях ад Беларускага нацыянальнага камітэта да Першага ўсебеларускага з'езда, які прызнаў права беларускага народа на самавызначэнне і дэмакратычную форму праўлення. Рэалізацыі права беларусаў на ўласнае палітычнае развіццё спачатку ў рамках аўтаноміі, а з цягам часу — у межах незалежнай дзяржавы патрабавалі сябры Таварыства беларускай культуры, Таварыства дапамогі ахвярам вайны, Беларускай вайсковай арганізацыі, удзельнікі з'ездаў сялян, настаўнікаў, святароў, вайскоўцаў і іншых сацыяльна-прафесійных груп. Усё гэта дазваляе разумець беларускі грамадска-палітычны рух як цэнтр улады, які ў 1917 г. ўвесь час мацнеў і лагічна прывёў да абвяшчэння БНР [28].

Такім чынам, у беларускіх губернях, у адрозненні ад сталіцы, дзе выразна прасочваліся два ўладныя цэнтры ў выглядзе Часовага ўраду і Петрасавета, контуры ўлады не былі дакладныя, знаходзіліся ў рухомым стане. Правы на яе, акрамя ўрадавых структур і саветаў, прад'яўлялі гарадскія думы, земскія ўправы, ваенныя структуры, а таксама нацыянальныя арганізацыі. У выніку ў розных населеных пунктах у розныя часы ўлада дзялілася паміж дзвюма, трыма і болей цэнтрамі. Падобнае становішча можна ахарактарызаваць як шматуладдзе, якое да восені 1917 г. пераўтварылася ў безуладдзе, што, у сваю чаргу, стварыла глебу для захопу ўлады бальшавікамі.

### Бібліяграфічны спіс

1. Башко П. К. Советы рабочих, солдатских и крестьянских депутатов Белоруссии (март — октябрь 1917 г.) / П. К. Башко. — Минск: Наука и техника, 1987. — 253 с.

2. Бобруйская вечерняя газета «Голос народа». — 1917. — 3 авг. — № 58.

3. Богатырева, О. Н. Феномен двоевластия в 1917 г.: к вопросу о правовых и историко-культурных истоках / О. Н. Богатырева // Февральская революция 1917 года в России: история и современность: сборник материалов регионального научного семинара. — Екатеринбург: Уральский Центр Б. Н. Ельцина, 2007. — 140 с.

4. Бюллетень Белорусской рады XII армии. — 1917. — 18 дек. — № 1.

5. Варшавское утро. — 1917. — 2 июля. — № 397.

6. Варшавское утро. — 1917. — 17 сентября. — № 456.

7. Великая Октябрьская Социалистическая революция в Белоруссии. Документы и материалы. — Т. 1. — Минск: Государственное изд-во БССР, 1957. — 1007 с.

8. Верт, Н. История советского государства (1900—1991) / Н. Верт. — М.: Прогресс Академия, 1992. — 480 с.

9. Вольная Беларусь. — 1917. — 11 июня. — № 2.

10. Гісторыя Беларусі XIX — пач. XXI ст.: эксперым. вучэб. дапам. для 12-га кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з бел. і рус. мовамі навучання з 12-гадовым тэрмінам навучання (павыш. узровень) / І. Л. Качалаў, Н. Я. Новік, Я. К. Новік, В. А. Цяплова; пад рэд. Я. К. Новіка. — Мінск: Выд. Цэнтр БДУ, 2005. — 352 с.

11. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII — пачатку XXI ст. У 2 кн. Кн. 1 / А. А. Каваленя (і інш.); Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. — Мінск: Беларус. навука, 2011. — 584 с.

12. Гужалоўскі, А. А. Фарміраванне структур грамадзянскай супольнасці Беларусі ў 1917 г. / А. А. Гужалоўскі // Беларускі гістарычны часопіс. — 2017. — № 5. — С. 12—20.

13. Деникин, А. И. Очерки русской смуты / А. И. Деникин. — Т. 1. — Вып. 2. Париж: Изд-во Поволоцкого, 1922. — 245 с.

14. Игнатенко, И. М. Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии / И. М. Игнатенко. — Минск: Наука и техника, 1986. — 343 с.

15. Известия Витебского совета солдатских и рабочих депутатов. — 1917. — 27 июня. — № 34.

16. Ильин, В. В. Российская государственность: истоки, традиции, перспективы / В. В. Ильин, А. С. Ахиезер. — М.: Изд-тво МГУ, 1997. — 384 с.

17. Коваленко, Н.А. «Двоевластие» в России в 1917 году: новые подходы и взгляды / Н. А. Коваленко. // Научный вестник Московского государственного технического университета гражданской авиации. Серия история, философия, социология. — 2007. — № 113.

18. Ладысеў, У. Ф. Гісторыя Беларусі. XX — пачатак XXI ст.: вучэб. — метад. дапам. / У. Ф. Ладысеў, А. Г. Каханоўскі. — Мінск: БДУ, 2011. — 115 с.

19. Ленин, В.И. О двоевластии / В. И. Ленин. Полн. собр. соч. — 5-е изд. — Т. 31. — М.: Издательство политической литературы, 1969. — 671 с.

20. Лукьянчикова, Л. В. Проблемы становления политической демократии в России в период двоевластия (февраль–октябрь 1917 г.) / Л. В. Лукьянчикова // Вестник Балтийского федерального университета им. И. Канта. Серия: гуманитарные и общественные науки. — 2010. — Вып. 6.

21. Минский голос. — 1917. — 31 марта. — № 2392.

22. Минский голос. — 1917. — 16 апреля. — № 2405.

23. Минский голос. — 1917. — 3 мая. — № 2418.

24. Минский голос. — 1917. — 3 июня. — № 2443.

25. Могилевская жизнь. — 1917. — 7 окт. — № 70.

26. Могилевская жизнь. — 1917. — 2 ноября. — № 89.

27. Рабочая мысль. — 1917. — 21 ноября. — № 127.

28. Рудовіч, С. С. Час выбару: Праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе / С. С. Рудовіч. — МІнск: НВК «Тэхналогія», 2001. — 201 с.

29. Саракавік, І. А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І. А. Саракавік. — Мінск: «Современная школа», 2006. — 456 с.

30. Священник В. Лузгин. Прислужник старой власти / В. Лузгин // Известия Витебского совета солдатских и рабочих депутатов. — 1917. — 3 июня. — № 14.

31. Солдат-учитель. Стрижинская волость Дриссенского уезда // Известия Витебского совета солдатских и рабочих депутатов. — 1917. — 6 июля. — № 41.

32. Сяменчык, М. Я. Грамадска-палітычнае жыццё на Беларусі ў перыяд Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый (сакавік 1917 — сакавік 1918 гг.) / М. Я. Сяменчык. — Ч. 1. — Мінск: БДПУ, 2001. — 199 с.